З першых вуснаў

# «Палітычныя звадкі і непарадкі, якія ў нас адбываюцца ў момант выбараў і паслявыбарны перыяд, выявілі шэраг недапрацовак у розных сістэмах кіравання»

## Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка заслухаў даклад старшыні Следчага камітэта Івана Наскевіча

**Кіраўніка дзяржавы, у першую чаргу, цікавіла, як складваецца сітуацыя ў краіне з пункту гледжання раскрыцця злачынстваў, асаблівую ўвагу ён звярнуў на расследаванне крымінальных спраў, якія мелі грамадскі рэзананс, і цяпер знаходзяцца на кантролі. Пра гэта паведамляе прэс-служба Прэзідэнта.**

«Па-другое (утойваць няма чаго, як кажуць, не было б шчасця, ды няшчасце дапамагло), палітычныя звадкі і непарадкі, якія ў нас адбываюцца ў момант выбараў і паслявыбарны перыяд, выявілі шэраг недахопаў, можа, недапрацовак у розных сістэмах кіравання, органах улады. Што паказваюць гэтыя падзеі з пункту гледжання Следчага камітэта? Якія ўрокі нам неабходна з гэтага атрымаць?» — задаў пытанні Аляксандр Лукашэнка.

Па словах Івана Наскевіча, Следчы камітэт сёлета спакойна і планамерна выконвае свае задачы па прызначэнні. На фоне грамадска-палітычных мерапрыемстваў, эпідэміялагічнай сітуацыі ўзровень злачыннасці ў краіне знізіўся прыкладна на 8 % у параўнанні з папярэднім годам. «Адпаведна, зменшылася і нагрузка на Следчы камітэт», — дадаў старшыня Следкама.

Прэзідэнт удакладніў, якія віды злачынстваў насцярожваюць больш за ўсё.

«Часткова змянілася структура злачыннасці, крэн адбыўся ў бок злачынстваў у сферы інфармацыйных тэхналогій. Гэта тэндэнцыя апошніх гадоў. Колькасць гэтых злачынстваў няўхільна расце, і праваахоўны блок таксама пераарыентаваўся на тое, каб раскрываць такія злачынствы з дапамогай тых жа інфармацыйных тэхналогій», — перадае словы Івана Наскевіча прэс-служба Прэзідэнта.

Паводле БелТА, пасля сустрэчы з кіраўніком дзяржавы старшыня Следчага камітэта расказаў журналістам, што за студзень — жнівень разгледжана 92,5 тысячы заяў і паведамленняў аб учыненых злачынствах, заведзена амаль 59 тысяч крымінальных спраў, 25 тысяч чалавек прыцягнуты да крымінальнай адказнасці. «Прыкладна ў паўтара раза ў параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года павялічылася колькасць злачынстваў у сферы інфармацыйных тэхналогій», — дадаў ён.

Іван Наскевіч адзначыў, што некаторыя грамадзяне, разлічваючы на занятасць праваахоўнікаў, адважыліся на ўчыненне «відавочных злачынстваў». Напрыклад, разбойныя нападзенні на букмекерскую кантору і магазін бытавой хіміі ў Мінску. У вельмі кароткія тэрміны абодва злачынствы былі раскрыты, і цяпер заведзены крымінальныя справы.

# «Галоўная наша задача, праблема, занепакоенасць — гэта эканоміка»

**У суботу, 5 верасня, Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка правёў нараду з членамі Савета бяспекі нашай краіны, на якой, у прыватнасці, абмяркоўвалася работа нацыянальнай эканомікі і задачы, якія стаяць у сувязі з гэтым.**

«Заўсёды гаварыў, хачу яшчэ раз нагадаць, што галоўная наша задача, праблема, занепакоенасць — гэта эканоміка. Ёсць эканоміка, значыць будзе ўсё астатняе. Няма эканомікі — тады не трэба разлічваць ні на ідэалогію, ні на бяспеку, спакой у краіне», — цытуе беларускага лідара яго прэс-служба.

Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што апошнім часам зроблена нямала, каб нармальна функцыянавала эканоміка. Па яго словах, міжурадавыя кансультацыі з Расіяй даюць станоўчы вынік, абстаноўка ў Беларусі на фоне пандэміі значна лепшая, чым у іншых дзяржавах: гэта датычыцца і статыстыкі па захваральнасці, і эканомікі. «Мы не спыняліся, мы выпрацоўваем і ў нас ёсць шанц, якім сёння карыстаемся, прадаць нашу прадукцыю. Прадаць з добрай дабаўленай вартасцю, з добрым прыбыткам», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Ён звярнуў увагу на апублікаваныя свежыя даныя ААН, згодна з якімі ў свеце ідзе інтэнсіўны рост попыту на прадукты харчавання. «Відавочна, і на іншыя тавары. Таму вельмі важна цяпер функцыянаванне нашых прадпрыемстваў, каб працавала эканоміка. І галоўнае пытанне, якое мы павінны цяпер абмеркаваць, — гэта не толькі бяспека, стабільнасць нашай дзяржавы, але як мы, людзі ў пагонах, павінны забяспечыць нармальнае функцыянаванне прадпрыемстваў, каб эканоміка давала нам вынік. Гэта — галоўнае», — лічыць Прэзідэнт.

У сувязі з гэтым ён прапанаваў удзельнікам нарады з гэтай пазіцыі паглядзець на тое, што трэба зрабіць, каб падтрымаць урад, прадпрыемствы, Нацыянальны банк. «Тое, аб чым я гаварыў. Нам трэба падтрымаць — усім, хто сёння займаецца бяспекай. А эканамічная бяспека — гэта немалаважны сегмент дзейнасці нашай дзяржавы. Таму эканоміка і яшчэ раз эканоміка!» — рэзюмаваў Прэзідэнт.

Ва ўрадзе

# БОЛЬШ ПАЎНАМОЦТВАЎ

**Распараджэннем прэм'ер-міністра Беларусі ад 4 верасня 2020 года створана міжведамасная рабочая група для падрыхтоўкі прапаноў па пашырэнні паўнамоцтваў урада Беларусі і мясцовых органаў улады. Пра гэта паведамляе прэс-служба Савета Міністраў.**

Міжведамаснай рабочай групе пад кіраўніцтвам першага намесніка прэм'ер-міністра Мікалая Снапкова да 20 верасня 2020 года даручана правесці комплексны аналіз заканадаўства па пытаннях адміністрацыйна-тэрытарыяльнага ўладкавання, зацвярджэння генеральных планаў, архітэктурнай і горадабудаўнічай дзейнасці; найменняў адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак, устанаўлення мясцовай геральдыкі; узгаднення кадравых прызначэнняў, устанаўлення колькасці і структуры мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў; адабрання і давання зямельных участкаў, працы з дзяржаўнай маёмасцю; іншых пытаннях, якія прадугледжваюць уключэнне ў іх рашэнне кіраўніка дзяржавы.

Таксама міжведамаснай працоўнай групе неабходна выпрацаваць на аснове праведзенага аналізу сістэмныя прапановы па пашырэнні паўнамоцтваў урада і мясцовых органаў улады ў самастойным прыняцці рашэнняў і ўнесці іх у Савет Міністраў.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

Меркаванне

# «Такую моладзь мы сёння не бачым на вуліцах, і здаецца, што яе быццам няма»



**Член Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па адукацыі, культуры і навуцы Сяргей КЛІШЭВІЧ расказаў пра моладзь, якая ўдзельнічае ў акцыях па падтрымцы дзеючай улады.**

— Моладзь, якая падтрымлівае Прэзідэнта, — людзі, якія ўжо сталі на ногі, хто мае адукацыю, нейкі вопыт у грамадскай дзейнасці, працуе на прадпрыемствах нашай краіны, хто разумее, як будуецца жыццё, фарміруецца эканоміка. Моладзь па іншы бок (не ў агульнай масе) — там ёсць і тыя, якія дзесьці аступіліся ці знаходзяцца за плячыма бацькоў, не ведаюць, як зарабляюцца грошы. Такія людзі часцей за іншых падпадаюць пад уплыў іншых сіл, асабліва сёння, калі мы бачым, што гэта не проста падман, а ўздзеянне на псіхіку людзей. Зразумела, што больш да такога ўздзеяння схільныя маладыя людзі, якія не маюць жыццёвага вопыту, «супрацьяддзя». Яны і становяцца ахвярамі інфармацыйнай вайны.



Фота БелТА.

У моладзі, якая падтрымлівае айчынны сцяг, няма намеру выйсці на мітынг, каб пакрычаць, штурхнуць нешта ў бок праваахоўнікаў. Яны занятыя справамі — убіраюць ураджай, працуюць у арганізацыях, займаюцца сваёй сям'ёй, выхоўваюць дзяцей. Такую моладзь мы сёння не бачым на вуліцах, і здаецца, што яе быццам няма. Але зараз, калі пайшлі акцыі ў падтрымку Прэзідэнта, часта можам заўважыць там маладых хлопцаў і дзяўчат, маладыя сем'і.

Яшчэ адзін важны аспект — гэта цкванне, арганізаванае ў дачыненні да тых, хто падтрымлівае кіраўніка дзяржавы. Любыя факт, пост, карцінка ў падтрымку дзеючага Прэзідэнта становяцца нагодай для цкавання і булінгу. З ім сутыкаюцца і настаўнікі, і міліцыянеры, і дзяржслужачыя. Не кожны гатовы вытрымаць гэтае цкаванне, таму стрымлівае сябе ад такіх пастоў — у іншым выпадку яму становіцца страшна за сябе, сваю сям'ю, бо ёсць канкрэтныя пагрозы.

Тут мы маем справу з інфармацыйна-прапагандысцкай вайной, і гэта негатыўна адбіваецца на эмацыянальным стане тых, хто падтрымлівае ці не падтрымлівае ўладу. Я б тут параіў пачакаць, бо доўга трымаць людзей у такім эмацыянальным напружанні немагчыма. Мы бачым, што яно ўжо спадае, людзі пачынаюць вяртацца з гэтага свету дэзінфармацыі ў рэальнае жыццё, думаюць пра асабістыя справы, работу, сям'ю.

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## Кітайскі шматразовы касмічны апарат паспяхова вярнуўся на Зямлю



Эксперыментальны кітайскі касмічны апарат шматразовага выкарыстання паспяхова прызямліўся ў запланаваным месцы пасадкі. Пра гэта паведаміла афіцыйнае інфармацыйнае агенцтва «Сіньхуа», назваўшы ўдалае завяршэнне выпрабаванняў тэхналагічным прарывам, які дазволіць зрабіць таннейшымі палёты ў космас. У паведамленні падкрэсліваецца, што карабель прызначаны для мірнага даследавання касмічнай прасторы. Ён быў выведзены на арбіту ракетай-носьбітам «Чанчжэн-2F» з касмадрома Цзюцюань, паведаміла Кітайская карпарацыя касмічнай навукі і тэхнікі (CASC). Кітай яшчэ тры гады таму анансаваў, што ў 2020 годзе запусціць касмічны карабель, які можа лятаць як самалёт і будзе шматразовым, што павялічыць частату запускаў і знізіць іх кошт.

## Саудаўская Аравія знізіла цэны на нафту

Як паведаміла Bloomberg, гэта азначае, што найбуйнейшы сусветны экспарцёр рыхтуецца да ваганняў попыту на паліва ва ўмовах новых успышак каранавіруса па ўсім свеце. У прыватнасці, дзяржаўная кампанія Saudi Aramco знізіла кошт экспартных гатункаў Arab Light для Азіі — асноўны рынак вытворцы — у кастрычніку на $1,4 за бараль. Цэны для пакупнікоў нафты ў Еўропе і ЗША таксама зменшыліся, адзначае Bloomberg. У 2020 годзе попыт на нафту рэзка ўпаў пасля таго, як пандэмія прымусіла ўрады розных краін увесці каранцін, абмежаваць перамяшчэнні і пакінуць людзей дома. Як адзначыла Bloomberg, рашэнні Саудаўскай Аравіі звычайна задаюць тон для іншых нафтагазавых дзяржаў Блізкага Усходу, уключаючы Ірак і Аб'яднаныя Арабскія Эміраты, якія з'яўляюцца другім і трэцім па велічыні вытворцамі ў АПЕК.



## Аналітыкі назвалі сямейны бізнес найбольш устойлівым падчас пандэміі



Сямейныя кампаніі, акцыі якіх гандлююцца на біржы, у першым паўгоддзі прыкладна на 300 базісных пунктаў абышлі несямейныя прадпрыемствы па росце капіталізацыі. Аб гэтым сведчаць даныя даследчага інстытута Credit Suisse (CRSI). Сямейны бізнес дэманстраваў найлепшыя паказчыкі ва ўсіх рэгіёнах і сектарах, адзначаецца ў дакладзе. Даследаванне правялі па базе даных, якая ўключае больш за тысячу публічных кампаній па ўсім свеце, у якіх заснавальнік або члены яго сям'і маюць долю не менш за 20 % або кантралююць па меншай меры 20 % галасоў. «Пандэмія COVID-19 мела значны ўплыў на рост фондавых рынкаў і іх валацільнасць сёлета. Сямейныя кампаніі звычайна маюць ахоўныя характарыстыкі вышэй за сярэдні ўзровень, якія дазваляюць ім дэманстраваць добрыя вынікі, асабліва ў перыяды рынкавай напружанасці», — адзначаецца ў дакладзе.